отдельных произведений массовой культуры, так и массовизации шедевров классики.

Таким образом, массовая культура оказывается способной объединять феномены самого разного порядка, потому что она самоопределяется не через отталкивание от других форм и образцов, а через их присвоение. Массовая культура не ставит себе цели переосмысливать или интерпретировать содержание самой классической музыки. Классика необходима массовой культуре для расширения спектра культурных продуктов, доступных для восприятия широкой аудитории и вместе с тем обладающих необычными свойствами. Classical crossover сегодня успешно популяризируется и активно прогрессирует в своем развитии, привлекая все больше профессиональных исполнителей и поклонников в разных странах мира.

1. *Журкова, Д. А.* Классическая музыка в современной массовой культуре России: автореф. дис…. канд. культурологи: 24.00.01 ; Гос. ин-т искусствознания [Электронный ресурс] / Д. А. Журкова // Человек и наука. – Режим доступа : http://www.cheloveknauka.com/klassicheskaya-muzyka-v-sovremennoy-massovoy-kulture-rossii#ixzz4eWvkZwxW. – Дата доступа : 13.04.2018.

2. *Данько, Л. И.* Музыкальное направление Classical crossover в современной аудиовизуальной культуре : автореф. дис. … канд. иск.: 17.00.09 [Электронный ресурс] / Л. И. Данько ; С-Петерб. гуманит. ун-т профсоюзов. – Режим доступа : http://www.cheloveknauka.com/muzykalnoe-napravlenie-classical-crossover-v-sovremennoy-audiovizualnoy-kulture. – Дата доступа : 12.04.2018.

3. Классический кроссовер [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.diletant.media/articles/33425508/. – Дата доступа : 07.04.2018.

4. ClassicalCrossover [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.classical-crossover.co.uk. – Дата доступа : 17.04.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ФЕНОМЕН ДЫСКРЫМІНАЦЫІ Ў КАНТЭКСЦЕ ФІЛАСОФСКАЙ РЭФЛЕКСІІ

***А. І. Бабко,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Дыскрымінацыя – гэта рэстрыктыўнае абыходжанне з пэўнай групай людзей, падставай для якога з’яўляецца рэлевант-

ная з грамадскага пункту гледжання супольная іх прымета (этнічная або расавая прыналежнасць, пол, узрост, сэксуальная арыентацыя і г. д.). Дыскрымінацыйныя практыкі неабавязкова маюць негатыўны характар [1, с. 330–331; 2], аднак у большасці выпадкаў яны выступаюць як несправядлівыя, а таксама (у канчатковым выніку) выклікаюць моцныя разбуральныя эфекты – і ў дачыненні да тых, хто іх здзяйсняе, і ў дачыненні да іх ахвяр. Што да апошніх, дык яны ставяцца ва ўмовы, якія зневажаюць іх гонар і годнасць, ствараюць істотныя перашкоды для іх самаразвіцця, для іх поўнай самарэалізацыі і ў выніку штурхаюць тых, хто страціў надзею і волю да змагання, у паўзмрочны свет алкаголю, наркотыкаў, прастытуцыі, гвалту, нянавісці і злачынстваў. На супрацьлеглым полюсе адпаведнага дачынення назіраецца маральная дэзарыентацыя, якая можа перарасці ў поўную дэградацыю, у здольнасць здзяйсняць бесчалавечныя ўчынкі (пра што яскрава сведчыць прыклад нацыстаў). Відавочна, што такога кшталту практыкі павінны быць выкаранены з грамадскага жыцця і што іх філасофская аналітыка павінна здзяйсняцца ў кантэксце вырашэння дадзенай задачы.

Найпершае пытанне, на якое неабходна адказаць у рамках згаданай аналітыкі, датычыць дасягальнасці акрэсленай вышэй мэты. Ці не занадта моцныя карані мае дыскрымінацыя ў сацыяльным свеце і нават у нашым Сусвеце наогул? Ці не сягаюць яны ў найглыбейшы структурны пласт рэчаіснасці (хоць гэта і не ўсведамляецца іх носьбітамі і ахвярамі)? Згодна з другім пачаткам тэрмадынамікі паніжэнне энтрапіі ў пэўным сегменце сістэмы павінна суправаджацца (павінна быць «аплочана» [3, с. 30]) яе павышэннем у іншым сегменце. Ускладненне, упарадкаванне, развіццё мусіць адбывацца, такім чынам, за кошт дэградацыі, разбурэння («дыскрымінацыі») іншага. (У дадзенай сувязі цалкам зразумелым робіцца той факт, што некаторыя выбітныя прадстаўнікі сучаснага прыродазнаўства, напрыклад вядомы французскі біёлаг Ж. Мано, прыйшлі да глыбока песімістычнага светабачання.) Ці не сведчыць гэта пра заканамерны, неабходны характар дыскрымінацыйных практык, якія не маглі не ўкараніцца ў душах людзей і іх учынках?

Каб разабрацца ў дадзенай сітуацыі і прыйсці да слушнай, абгрунтаванай высновы адносна магчымасці ці немагчымасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкрасліць дыскрымінацыю з грамадскага жыцця, неабходна даць ясны і выразны адказ на пытанне: чалавек заўжды і ўсюды застаецца падпарадкаваным неабходнасці ці ён здольны ўзняцца да рэалізацыі прынцыпу свабоды, стварыць для сябе пэўны яе арэал? Зрабіўшы выбар на карысць другой часткі дадзенай альтэрнатывы, можна ўпэўнена сцвярджаць, што ў межах нашага арэала свабоды задача пераадолення дыскрымінацыйных практык з'яўляецца вырашальнай і мы павінны зрабіць усё, што ад нас залежыць, для іх выкаранення. (Неабходна адзначыць, што і ў сучаснай навуцы распрацоўваецца карціна прыроды, у якой яна паўстае не як механічны антыпод чалавечаму свету, а як блізкая да яго і адкрытая да дыялагічных стасункаў з ім. Адпаведныя канцэпцыі могуць быць уключаны ў кантэкст аналізу феномена дыскрымінацыі і пошуку адказу на пастаўленае вышэй пытанне, датычнае магчымасці яго выключэння з грамадскага жыцця.)

Аднак пры ўсёй ганебнасці дыскрымінацыйных практык можа скласціся ўражанне, што ў межах пэўнага пункту гледжання, пэўнай перспектывы магчыма рэлятывізацыя іх негатыўнага характару. Ці не дае такія магчымасці дыялектычная метадалогія, згодна з якой адмоўнае і станоўчае не раздзелены безданню, а звязаны паміж сабой, так што кожнае ўтрымлівае сваё іншае? Ці не нясе ў сабе (безумоўна, адмоўны) феномен дыскрымінацыі станоўчыя рысы (напрыклад, як аснова для барацьбы, для дзейнасці, для пошуку)? Такога кшталту аргументы маюць абстрактны характар, і на чыста абстрактным узроўні з імі надзвычай цяжка палемізаваць. Яны не павінны, аднак, закрываць ад нас той факт, што рэальныя дыскрымінацыйныя практыкі закранаюць лёсы рэальных людзей, у самых адыёзных сваіх праявах выклікаюць іх пакуты ці нават смерць. Той факт, што ва ўмовах несвабоды, абмежаванняў і рэстрыкцый чалавек змушаецца да дзейнасці, да пошуку выйсця (і гэтая дзейнасць можа быць творчай, выніковай – пра што яскрава сведчыць культура блюза [1, с. 331–333]), ні ў якім разе не апраўдвае наяўнасць дыскрымінацыйных бар'ераў у грамадстве і не павінен адцягнуць увагу ад неабходнасці іх знішчэння. Ва ўсіх выпадках разбуральныя іх эфекты і наступствы настолькі моцныя, што не дапускаюць прымірэння з дадзеным феноменам, яго апраўдання ці рэлятывізацыі адмоўнай яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ацэнкі. У дадзенай сувязі важна адзначыць таксама той відавочны момант, што высокае памкненне да творчасці зусім не абавязкова павінна грунтавацца на негатыўных феноменах кшталту дыскрымінацыі. Вострыя духоўныя калізіі і супярэчнасці, якія сапраўды выступаюць як неад'емная перадумова згаданага памкнення, з неабходнасцю паўстаюць і ў працэсе інтэнсіўнага свабоднага самаразвіцця асобы (няма ніякіх сумненняў у тым, што абсалютная большасць людзей аддасць перавагу менавіта такой мадэлі разгортвання творчай дзейнасці).

Своеасаблівая «ідэалізацыя» дыскрымінацыйных практык (ці, дакладней, пэўных іх аспектаў) можа быць вынікам не толькі абстрактных дыялектычных разваг, але і больш канкрэтных інтэлектуальных пазіцый, якія грунтуюцца на глыбокім, прынцыповым непрыняцці існага (сацыяльнага) свету, уласцівых яму структур, дачыненняў і мадэляў паводзін (сучасны польскі даследчык Д. Александровіч канстатаваў наяўнасць адпаведных тэндэнцый у рок-культуры, марксізме і хрысціянстве [1, с. 333–338]). Свет, што падаецца бездухоўным, халодным і жорсткім, разглядаецца як варты самаадмежавання ад яго, выключэння з яго дзеля прасоўвання альтэрнатыўнай сістэмы поглядаў, адносін, учынкаў – сістэмы, у якой арганічна ўвасабляюцца агульначалавечыя, сапраўды гуманістычныя ідэалы і каштоўнасці. Рэальная і дзейсная альтэрнатыва бяздушнаму грамадству, у якім пануе адчужэнне і эксплуатацыя, звязваецца, такім чынам, з ахвярамі дыскрымінацыйных практык, а іх адпаведны досвед можа інтэрпрэтавацца ў залежнасці ад тэарэтычнай спецыфікі пэўнай пазіцыі як фактар, што штурхае да змагання супраць старога свету і за пабудову новага, ці як пакутніцтва дзеля светлай прышласці, дзеля выратавання чалавецтва.

Неабходна пагадзіцца з Д. Александровічам у тым, што адпаведныя матывы сапраўды прысутнічаюць у згаданых культурных феноменах. Разам з тым, аднак, трэба мець на ўвазе, што «прыхарошванне» дыскрымінацыі адступае ў іх на задні план перад магутным пратэстам супраць дыскрымінацыйных бар'ераў і актаў, супраць несправядлівых формаў арганізацыі грамадскага жыцця. Таму ў дадзеным выпадку ідэалізуюцца не столькі дыскрымінацыйныя практыкі, колькі іх ахвяры (якія далёка не заўжды ўзнімаюцца да барацьбы за справядлівасць, раўнапраўе і свабоду).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грунтоўна важным кірункам філасофскага аналізу праблематыкі, звязанай з феноменам дыскрымінацыі, з'яўляецца выяўленне антыдыскрымінацыйнага патэнцыялу пэўных ідэй і канцэпцый. У гэтым плане неабходна вылучыць найперш скептычную філасофскую традыцыю, істотным і натуральным чынам знітаваную з прынцыпамі плюралізму і талерантнасці. Дадзеная тэза пераканальна пацвярджаецца і на прыкладзе яе найноўшага ўвасаблення – філасофскага постмадэрнізму, для якога справай гонару ўяўляецца абарона дыскрымінаваных, рэпрэсаваных, пазбаўленых права голасу. Аднак радыкальны рэлятывізм і антырэалізм, уласцівы згаданай плыні, робіць яе непрымальнай для шмат каго з прадстаўнікоў нашай філасофскай супольнасці. Яны маюць рацыю у тым, што прынцыпы гуманізму і талерантнасці могуць быць абгрунтаваны не толькі у рэчышчы скептычных і антырэалістычных падыходаў. Яскравым прыкладам філасофскай альтэрнатывы скептыцызму, якая выяўляе магутны антыдыскрымінацыйны патэнцыял, з'яўляюцца канцэпцыі, найхарактэрнейшая рыса якіх – прыхільнасць да ідэі дыялагізму. Раскрыццё згаданага патэнцыялу, аднак, мусіць быць тэмай спецыяльнага даследавання.

Такім чынам, філасофія можа і павінна ўзяць чынны ўдзел у працэсе пераадолення дыскрымінацыйных практык, што спрыяюць распусце і дэградацыі чалавека і грамадства. Гэты ўдзел з'яўляецца надзвычай спрыяльным і для самога філасофскага мыслення, для ўзмацнення яго гуманістычнага патэнцыялу.


1. *Aleksandrowicz, D.* Zwischen Ausgrenzumg und Universalanspruch / D. Aleksandrowicz // Diskriminierung – Antidiskriminierung / hrsg. von J. C. Joerden. – Berlin, Heidelberg : Springer, 1996. – S. 329–351.

2. *Altman, A.* Discrimination [Electronic resource] / A. Altman // The Stanford Encyclopedia of Philosophy Archive. – 2016. – Mode of access : https://plato.stanford.edu/archives/win2016/entries/discrimination/.

3. *Monod, J.* Le hasard et la nécessité: essai sur la philosophie naturelle de la biologie moderne / J. Monod. – Paris : Seuil, 1970. – 213 p.

4. *Prigogine, I.* Order out of Chaos: Man's New Dialogue with Nature / I. Prigogine, I. Stengers. – London : Flamingo, 1985. – XXXI, 349 p.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ